(1,1) [illegible]-1- 2011[illegible]100.indd 20.12.2011 17:42:10

Раённая масавая газета. Заснавана 24 сакавіка 1935 года

# ДОБРУШСКІ КРАЙ

21 снежня 2011 года
Серада

№100 (10110)

**ЗАЎТРА – ДЗЕНЬ ЭНЕРГЕТЫКА**

# Аператыўна і надзейна

## ліквідоўваюць аварыйныя адключэнні работнікі РДС



**Цэнтральны пульт раённай дыспетчарскай службы філіяла Гомельскіх электрасетак у Добрушы. На сцяне вялікая схема электразабеспячэння раёна.**

– Зараз у нас усе спажыўцы бесперабойна атрымліваюць электраэнергію, – расказвае начальнік службы Д.М. Кавецкі. – Здарыцца аварыйнае адключэнне – на выезд па яго ліквідацыі гатова аварыйная брыгада.

Калектыў дыспетчарскай службы абслугоўвае электралініі 0,4-10 кВт. Гэтым заняты 16 энергетыкаў – дыспетчары, манцёры, вадзіцелі.

20 год любімай справе аддаў дыспетчар Аляксандр Палянок. Вопыт і веды ён перадае маладым.

У любы момант гатовы выехаць на лінію, дзе адбылося аварыйнае адключэнне, вадзіцелі Юрый Гладышаў, Аляксандр Дзегцяроў, якія пры неабходнасці могуць выканаць і работу манцёраў.

– Яны надзейныя памочнікі, – у адзін голас заяўляюць манцёры Пётр Панфілаў і Уладзімір Купан.

З добрым настроем сустракаюць сваё прафесійнае свята энергетыкі дыспетчарскай службы, якія імкнуцца аператыўна і надзейна ліквідоўваць аварыйныя адключэнні, зводзіць іх да мінімуму.

**Мікола ШЫШОЎ**
**На здымку:**
**электраманцёр Яўгеній Валнянка,**
**дыспетчар Яўгеній Зайцаў**
**і вадзіцель Міхаіл Халюкоў**

**У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ**

## ПЕРАВЫШЭННЕ ЭКСПАРТУ НАД ІМПАРТАМ – ПЫТАННЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БЯСПЕКІ

*Канкрэтны вынік ад імпартазамяшчэння неабходна разглядаць праз паказчык сальда знешняга гандлю. Задача нумар 1 тут – выйсці на ўстойлівае перавышэнне экспарту над імпартам. Як адзначыў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, выступаючы на пастаянна дзеючым семінары кіруючых работнікаў, гэта пытанне не толькі эканамічнае, але і нацыянальнай бяспекі.*

«Міністры і губернатары кожны паасобку сёння могуць рабіць справаздачу аб значным росце экспарту і скарачэнні імпарту. Але, калі складзеш усё ў агульную скарбонку, у цэлым па краіне атрымліваецца адмоўнае сальда. Такога больш быць не павінна, – запатрабаваў кіраўнік дзяржавы. – Мы дамовіліся яшчэ ў пачатку года: міністры адказваюць за ўсю галіну, генерал-губернатар – за ўсю тэрыторыю».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў Беларусі пакуль не навучыліся прадаваць сваю прадукцыю. Усю мінулую пяцігодку назіралася ўстойлівае зніжэнне долі экспарту ў агульным аб'ёме прамысловай вытворчасці.

**Паводле БелТА**

## Сесія раённага Савета дэпутатаў

***26 снежня 2011 года ў 11 гадзін у вялікай зале пасяджэнняў раённага выканаўчага камітэта адбудзецца чарговая сесія раённага Савета дэпутатаў 26-га склікання***

На разгляд сесіі выносяцца наступныя пытанні:

*Аб справаздачы старшыні раённага Савета дэпутатаў А.М. Барсякова.*

Дакладчык – А.М. Барсякоў.

*Аб зацверджанні асноўных мэтавых паказчыкаў прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця Добрушскага раёна на 2012 год.*

Дакладчык – А.І. Барысёнак, намеснік старшыні райвыканкама.

*Аб праекце бюджэту раёна на 2012 год.*

Дакладчык – А.У. Сіліна, начальнік фінансавага аддзела райвыканкама.

*Аб перспектыўным плане работы раённага Савета дэпутатаў і яго органаў на 2012 год.*

Дакладчык – А.М. Барсякоў, старшыня раённага Савета дэпутатаў.

***Рэгістрацыя дэпутатаў і запрошаных – з 10 да 11 гадзін у фае залы пасяджэнняў райвыканкама.***

## Уважаемые жители г. Добруша и Добрушского района!

*Обращаем ваше внимание, что обратиться в райисполком по волнующим вас вопросам можно несколькими способами:*

1. Написать письмо и направить его по адресу:

**247050 г. Добруш, ул. кн.Ф.И.Паскевича, 11**.

2. Направить письмо по электронной почте, используя e-mail: isp@dobrush.gov.by

3. Позвонить по телефону **«горячей линии»** **142** ежедневно **с 9.00 до 17.00**.

4. Прийти на прием к председателю Добрушского райисполкома каждую вторую и четвертую среду месяца **с 14.00 до 20.00.** При этом можно предварительно записаться на данный прием по телефону **3-12-10** с 8.00 до 17.00.

ДОБРУШСКІ КРАЙ

**Подписка продлена до 27 декабря включительно.**

**Цена подписки**
месяц 8900 руб.
квартал 26 700 руб.

**Оставайтесь с нами!**

www. dk-smi.gomel-region.by

Индекс
64176 (инд)
63994 (вед)

**СРЕДА** 8 страниц
Больше страниц – больше информации о жизни района

**СУББОТА** 12 страниц
Деловой вестник + ТВ-программа, реклама

ISSN 2073-1000

**ПОГОДА**

Долгота дня 7.23
Луна
21, 22 декабря — в Скорпионе,
23, 24 — в Стрельце

Новолуние
24 декабря

| 22 декабря | 23 декабря |
|---|---|
| НОЧЬЮ 0…-2 | НОЧЬЮ -1…-3 |
| ДНЕМ 0…-2 | ДНЕМ -1…-3 |
| Сплошная облачность. | Сплошная облачность. |
| Возможен снег. | Возможен снег. |
| Ветер северо-западный, 5-7 м/с | Ветер северо-западный, 3-5 м/с |

(1,1) -2- 2011 100.indd 20.12.2011 17:42:16



**У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ**

## АД ЗНІЖЭННЯ ЦЭН НА ЭНЕРГАРЭСУРСЫ БЕЛАРУСЬ ЗЭКАНОМІЦЬ $3-4 МЛРД

*Аб гэтым паведаміў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на пастаянна дзеючым семінары кіруючых работнікаў рэспубліканскіх і мясцовых дзяржаўных органаў на тэму «Імпартазамяшчэнне як важнейшы фактар дасягнення збалансаванага развіцця эканомікі Рэспублікі Беларусь».*

Кіраўнік дзяржавы запатрабаваў ад кіраўнікоў прыняцця правільных кіраўніцкіх рашэнняў, глыбока прадуманых, вывераных, накіраваных у будучыню. На яго думку, імпартазамяшчэнне павінна стаць важнейшым фактарам дасягнення збалансаванага развіцця эканомікі Беларусі.

«Ужо на сённяшні дзень вышэйшыя органы ўлады і ўрад нямала зрабілі для таго, каб у будучым годзе было лягчэй. Як вы ведаеце, цэны на газ і нафту будуць не тыя. Мы яшчэ дамаўляемся, якімі яны будуць, але ўжо зразумела, што яны будуць не тыя. Дык вам і карты ў рукі. Больш як $3 млрд., а можа быць, і $4 млрд., мы атрымаем эканоміі за кошт зніжэння цэн на энергарэсурсы», – сказаў Аляксандр Лукашэнка.

## ВЫХАД НА ДАДАТНАЕ САЛЬДА ЗНЕШНЯГА ГАНДЛЮ – СТРАТЭГІЧНАЯ ЗАДАЧА

*Галоўныя шляхі яе вырашэння, па словах Прэзідэнта, – гэта нарошчванне экспарту і скарачэнне валютных затрат за кошт імпартазамяшчэння.*

Асаблівая значнасць імпартазамяшчэння ў тым, што яно з'яўляецца важнейшым дзяржаўным прыярытэтам, ад рэалізацыі якога залежыць эканамічная бяспека краіны. Нягледзячы на рэкордны прыток у бягучым годзе экспартнай выручкі, больш за $35 млрд., заробленых грошай усё роўна не хапае, каб аплаціць увесь імпарт.

Таксама не вырашана задача па істотным зніжэнні імпартаёмістасці эканомікі і выхадзе на дадатнае сальда.

Акрамя таго, прадукцыя, вырабленая пры рэалізацыі імпартазамяшчальных праектаў, мела ўзровень імпартнага складальніка ад 70 працэнтаў да 90 працэнтаў і прынцыпова не ўплывала на скарачэнне адмоўнага сальда. У сваю чаргу імпартаёмістасць спажывецкага рынку практычна не змянілася – у 2010 годзе імпарт спажывецкіх тавараў складаў 25 працэнтаў рознічнага тавараабароту, што адпавядае ўзроўню 2005 года. «Больш таго, час паказаў, што самі праграмы імпартазамяшчэння складаліся фармальна і не змяшчалі праекты, значныя для сектараў эканомікі рэгіёнаў», – адзначыў Прэзідэнт.

Разам з тым, кіраўнік дзяржавы лічыць, што няма неабходнасці ўсё замяшчаць айчыннымі таварамі. «Гэта нерэальна і не патрэбна. Але, калі ёсць попыт, калі нашы людзі гатовы па любой цане купляць гэтыя тавары, гэта значыць, існуе шырокі рынак, чаму не ствараюцца новыя магутнасці, каб задаволіць гэты плацежаздольны попыт?» – задаў пытанне Аляксандр Лукашэнка.

Ён таксама адзначыў, што для Беларусі цяпер адкрыты вялікі рынак Расіі і Казахстана. «Гэта значыць, што мы знаходзімся ў больш выгадным становішчы, чым вытворцы з трэціх краін, вымушаныя плаціць мытную пошліну. Таму мы можам прэтэндаваць на значную частку рынку», – лічыць кіраўнік беларускай дзяржавы.

Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: шмат з таго, што імпартуецца, можна элементарна вырабіць на ўмовах малых гарадоў і сельскіх населеных пунктаў, выкарыстоўваючы існуючыя маёмасць, будынкі і збудаванні.

**Паводле БелТА**

**В ОБЛИСПОЛКОМЕ**

**Любой шаг в экономике в конечном итоге должен повышать уровень жизни человека, отмечалось в облисполкоме на еженедельном аппаратном совещании, которое вел губернатор Владимир ДВОРНИК**

# Уровень жизни человека — главный ориентир

**ЧРЕЗВЫЧАЙНЫЕ СИТУАЦИИ**

На территории области на минувшей неделе произошло 20 пожаров, в которых 2 человека погибли, 3 получили травмы, проинформировал **начальник областного управления МЧС Юрий Парфененков.** По сравнению с прошлым годом количество чрезвычайных ситуаций сократилось на 14%, а вот число жертв увеличилось на 3%. По количеству же погибших на 10 тысяч населения Гомельская область находится на четвертом месте, уступая печальное лидерство Минской, Витебской и Могилевской областям.

Смотровыми комиссиями обследовано более 1100 домовладений граждан, большинство из которых относится к группе риска. Выявлено 880 фактов, влияющих на безопасность жизнедеятельности, 250 устранено сразу. Областным управлением МЧС изучен опыт работы смотровой комиссии Малоавтюковского сельского Совета депутатов Калинковичского района, которой в целом дана положительная оценка.

**ПРАВОПОРЯДОК**

В области зарегистрировано 219 преступлений, в том числе 3 убийства, доложил **начальник УВД облисполкома Валерий Полищук.** На дорогах области произошло 23 ДТП, в которых 2 человека погибли и 26 ранены. Задержаны 100 водителей в нетрезвом состоянии. Попрежнему 75% преступлений совершается в сельской местности. **Председатель комитета по труду, занятости и социальной защите облисполкома Петр Савицкий** озвучил результаты проведенного анализа: насколько криминальная статистика зависит от уровня средней зарплаты. Так, 65% краж произошло в сельскохозяйственных организациях, где средняя зарплата не превышает 1,2 миллиона рублей, и 4% там, где зарплата более 1,5 миллиона. "Вывод очевиден: где есть достаток, нет повода совершать преступления, — подчеркнул Владимир Дворник. — Силовым методом мы не решим проблемы преступности в сельской местности, необходимо действовать экономическим путем. Наращивая объемы производства, увеличивая производительность труда, мы сможем обеспечить достойный уровень жизни. А если человек не накормлен, он не пойдет ни в Дом культуры танцевать, ни в спортзал заниматься. В поисках средств на пропитание у него одна дорога — преступать закон".

**ГРАНИЦА**

На минувшей неделе незначительно выросли пассажирский и транспортный потоки через гомельский участок государственной белорусско-украинской границы, отметил **командир пограничной группы Игорь Мороз.** Пресечен незаконный вывоз товарно-материальных ценностей на сумму более 300 миллионов рублей. В пределах разрешенного количества из Беларуси в основном везут молочные и мясные продукты (сгущенное молоко, консервы, колбасы), а ввозят трикотажные изделия.

**ЭКОНОМИКА**

Из 15 прогнозных показателей по итогам 11 месяцев Гомельщина не выполнила 5, констатировала **председатель комитета экономики облисполкома Эльвира Карницкая.** В их числе валовой региональный продукт, сальдо внешней торговли в целом по области, а также без учета нефти и нефтепродуктов, инвестиции в основной капитал и строительство жилья. "Необходимо выстроить четкую систему работы с инвесторами, — считает председатель облисполкома. — Процесс обсуждения инвестиционных предложений и подписания договоров должен проходить динамично, без пробуксовки на отдельных этапах. У нас много нереализованных возможностей. Порой из-за бюрократизма отдельных чиновников инвесторы уходят в другие области. Это недопустимо".

**ЖИЛИЩНО-КОММУНАЛЬНОЕ ХОЗЯЙСТВО**

Предприятия ЖКХ области в целом справляются со своими задачами, сообщил **начальник управления жилищно-коммунального хозяйства облисполкома Дмитрий Згурский.** Срывов в теплоснабжении не допущено. Однако из-за сдерживания тарифов для населения и юридических лиц отдельные предприятия ЖКХ терпят убытки, поскольку не могут полностью возместить эти затраты. Губернатор же потребовал пересмотреть принцип работы комплекса ЖКХ области в предстоящем году, искать пути и возможности для хозрасчетной деятельности и рентабельной работы. "Необходимо выработать систему заинтересованности, в том числе и материальной, тех руководителей, которым удалось сократить коммунальные расходы", — предложил Владимир Дворник.

**СЕЛЬСКОЕ ХОЗЯЙСТВО**

Как проинформировал председатель **комитета по сельскому хозяйству и продовольствию облисполкома Валентин Бабок,** производство молока удалось увеличить до 110,3% к уровню прошлого года. Наращиваются объемы производства мяса крупного рогатого скота, свиней, птицы. Погодные условия позволяют продолжать зяблевую обработку полей. Накапливаются минеральные удобрения, подготавливаются семена яровых культур. Особое внимание председатель облисполкома заострил на необходимости повышения объема производства в хозяйствах тех районов, где отмечается самый низкий уровень зарплаты (Кормянском, Хойникском, Лоевском, Лельчицком).

**"Гомельская праўда", 20 декабря 2011 года**

**НА КОНТРОЛЕ У ПРЕДСЕДАТЕЛЯ**

# «Как работаем, такой и результат будет»

*Данное высказывание — суть отношения к делу как руководителя, так и коллектива в целом. Вот почему, обобщая большой, разноплановый и взыскательный разговор на аппаратном совещании у председателя в понедельник, 19 декабря, председатель районного исполнительного комитета Ольга Федоровна Мохорева так подвела его итог: «Надо всем серьезно работать, успех зависит только от нас».*

**Итоги подведены, задачи поставлены**

С отчета о поездке председателя райисполкома О. Мохоревой началось аппаратное совещание в понедельник. В Минске на постоянно действующем семинаре руководящих работников республиканских и местных государственных органов на тему «Импортозамещение как важнейший фактор достижения сбалансированного развития экономики Республики Беларусь» были рассмотрены такие важные вопросы как импортозамещение, экономия и бережливость. Как отметила Ольга Федоровна, в нашем районе по импортозамещению работает бумажная фабрика, но рассматривая работу в этом направлении, нужно думать обо всех предприятиях района. «Нас просто раздавят конкуренты из-за границы, если не будем экономить каждую заработанную копейку», — констатировала председатель райисполкома. Бережливость и экономия — она во всем, подчеркнула О. Мохорева: и в экономии топлива при использовании служебного транспорта, и в бережном расходовании кормов, заготовленных для крупного рогатого скота. Не все руководители хозяйств и предприятий живут с чувством ответственности: ответственности за людей, за вверенную организацию, за ее будущее. И это нужно искоренять, лечить.

С отчетом о посещении Воложинского района выступил заместитель председателя райисполкома Н. В. Лысенко. Он поделился с присутствующими впечатлениями о развитии агроэкотуризма на Минщине: благодаря открытию агроусадьбы была возрождена умирающая деревня.

**Оглянуться назад: выполнить работу над ошибками**

Состоянию работы на земле, благоустройству территорий была посвящена основная часть аппаратного совещания. И вновь присутствующие совершили виртуальное путешествие по району, заслушав отчеты руководителей организаций, ведущих работу вдоль дорог и в населенных пунктах района. Сложилась масштабная картина по наведению порядка на земле. Населенные пункты Степь, Нивки, Усохи, Николаевка, Ольховое, Тереховка, Борщовка, Кузьминичи вот уже которую неделю являются объектами по наведению порядка. «Я не раз говорила, что многое по наведению порядка в районе уже сделано, но обратите внимание на незавершенные участки по благоустройству: нераскорчеванные кусты, до конца не распаханные освободившиеся участки земли, — резюмировала председатель райисполкома, — они требуют, чтобы мы вернулись назад и довели начатое дело, важное дело до конца».

**Молочным рекам быть?**

Ответ на этот вопрос может быть только утвердительным. Только такая позиция по производству молока должна быть у руководителей сельхозорганизаций района. О. Ф. Мохорева поставила задачу перед аграрниками района: показатели по производству молока довести до 110 процентов к уровню прошлого года, прибавка по молоку должна составлять не менее одного килограмма на корову.

Подверглись критике на аппаратном совещании по производству молока такие сельхозпредприятия района как СПК «Крупец», СПК «Оборона», СПК «Круговец», СПК «Хорошевский», КСУП «Завидовское», КСУП "Агрокомбинат «Новый путь», ЧСУП «Тереховка-Агро».

**Происшествия**

Как доложил В. А. Малиновский, начальник районного отдела по ЧС, за прошедшую неделю на территории района произошло два пожара в Огородне и Гордунах.

Смотровыми комиссиями посещены 29 одиноко проживающих пожилых людей, три многодетные семьи, четыре — прочие. По результатам посещений составлено три акта. С начала года смотровыми комиссиями составлено 296 актов, из которых по 282 нарушения были устранены.

**Правопорядок**

За прошлую неделю на территории района было совершено четыре преступления, из которых две кражи из автомобилей, находящихся в неосвещенных дворах нашего города, отметил В. В. Марченко, начальник РОВД райисполкома. Он обратил внимание на недостаточную работу коммунальных служб города в вопросах освещения городских улиц и, в особенности, дворовых территорий многоэтажных домов.

Кроме этого, небеспокойной остается ситуация и с перемещением металлолома по территории района: на прошлой неделе его было изъято более 16 тонн.

**Другие вопросы**

На аппаратном совещании были заслушаны отчеты о выполнении данных на прошлой неделе поручений различным службам и организациям района.

**Ольга СЕЛЕЗНЕВА**

(1,1) -3- 2011 100.indd 20.12.2011 17:42:17





**Добрушскаму раёну – 85 год**

# “Герой працы”: апраўдваць сваё імя

**Напрыканцы 80-90-х гадоў мінулага стагоддзя паспяхова развівалася прамысловасць нашага раёна. Флагманам індустрыі Добрушчыны была папяровая фабрыка “Герой працы”. У той час кіраўніком прадпрыемства з’яўляўся Аляксей Пракопавіч Няміраў. Яго вызначаў глыбокі прафесіяналізм і сапраўдны арганізатарскі талент.**



***Аляксей Пракопавіч Няміраў нарадзіўся 28 сакавіка 1931 года ў вёсцы Ільінка Багданавіцкага раёна Свярдлоўскай вобласці. Скончыў рамеснае вучылішча, Уральскі лесатэхнічны інстытут. Працаваў на Навалялінскім цэлюлозна-папяровым камбінаце. У 1951-1954 гадах служыў у Савецкай Арміі. Дэмабілізаваўшыся, вярнуўся на роднае прадпрыемства, дзе ад рабочага вырас да галоўнага інжынера.***

***У 1978 годзе прызначаны галоўным інжынерам папяровай фабрыкі “Спартак” у Шклове. З 1981 па 1993 гады ўзначальваў калектыў добрушскіх папернікаў.***

***А.П. Няміраў – аўтар 4 вынаходніцтваў у галіне папяровай прамысловасці. Узнагароджаны медалямі “За працоўную доблесць”, “За доблесную працу”.***

Сёння мы прапануем інтэрв’ю з А.П.Няміравым.

**– Аляксей Пракопавіч, калі ласка, раскажыце, як усё пачалося.**

– Працаваў галоўным інжынерам папяровай фабрыкі “Спартак” у Шклове. Нечакана выклікалі ў Мінск. Адтуль вярнуўся дырэктарам папяровай фабрыкі ў Добрушы. 12 лістапада 1981 года ўпершыню пераступіў парог дырэктарскага кабінета гэтага прадпрыемства.

**– Што сабой уяўляла на той час добрушскае прадпрыемства?**

– Фабрыка выпускала 63 працэнты чарцёжнай паперы, 27 – малявальнай і 13 працэнтаў школьных сшыткаў на прасторах былога Савецкага Саюза. Скажу шчыра: прадпрыемства было, як кажуць, на хаду, спраўлялася з даведзенымі планамі.

Праўда, напрыканцы года пад пагрозай зрыву аказаўся план па агульным выпуску паперы і, як следства, – пазбаўленне прэміі за апошні квартал усяго калектыву. Па гэтым пытанні тройчы збіралі вытворчую нараду. Прымаліся толькі прапановы. Выращвалі пасылаць ганцоў з ліку інжынерна-тэхнічных работнікаў.

Дабіліся жаданага: на прадпрыемства паступіла патрэбная колькасць макулатуры, што дазволіла выканаць гадавы план па вырабе паперы.

**– Аляксей Пракопавіч, у час Вашага дырэктарства прадпрыемства перажывала перыяд мадэрнізацыі, рэканструкцыі і новага будаўніцтва. Калі ласка, раскажыце пра гэта больш падрабязна.**

– На прадпрыемстве з’явілася практычна новая цеплаэлектрацэнтраль. У прасторнай пабудове былі ўстаноўлены два катлы магутнасцю кожнага 35 тон пару ў гадзіну. Уступіла ў строй сёмая папераробчая машына. Была куплена і зманціравана паточная лінія “Біламацік” па выпуску школьных сшыткаў. Дарэчы, гэтая лінія працуе і па сённяшні дзень. Агульныя сшыткі пачалі выпускаць на лініі ПВТ.

**– Як вядома, 80-я гады мінулага стагоддзя вызначаліся размахам жыллёвага будаўніцтва, узвядзеннем аб’ектаў сацкульт-быту.**

**Фабрыка выпускала 63 працэнты чарцёжнай паперы, 27 – малявальнай і 13 працэнтаў школьных сшыткаў на прасторах былога Савецкага Саюза. Прадпрыемства было, як кажуць, на хаду, спраўлялася з даведзенымі планамі.**

– Неяк падлічыў: за 12 год на фабрыцы было здадзена ў эксплуатацыю 600 кватэр.

Штогод у нас было па 50 сем’яў наваселаў – рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў.

У цэнтры горада мы ўзвялі 160-кватэрны жылы дом, 143-кватэрную дзевяціпавярхоўку-інтэрнат сямейнага тыпу. Чатыры пяціпавярхоўкі ў той час упрыгожылі фабрычны мікрараён па вуліцы Маскоўскай. Для рабочых прадпрыемства ўзвялі прасторную сталовую.

Гаспадарчым спосабам будавалася вуліца Я. Коласа. Штогод на ёй з’яўляліся дамы на чатыры сям’і. Заўважу, што вуліца ўзводзілася на месцы старога рэчышча Іпуці.

**– У той час заслугоўваў увагі вопыт развіцця падсобнай гаспадаркі прадпрыемства.**

– Падсобная гаспадарка давала танную прадукцыю для фабрычнай сталоўкі, свініна і гародніна рэалізоўваліся рабочым. Ведаеце, у той час была напружанка з забеспячэннем насельніцтва прадуктамі харчавання. Падсобную гаспадарку мы развівалі не ад добрага жыцця. Яе мы лічылі важным вытворчым падраздзяленнем.

Утрымлівалі ў сярэднім 120 свіней, на плошчы 4 тысячы квадратных метраў у цяпліцах вырошчвалі гародніну. У снежні, напрыклад, ужо былі свежыя гуркі.

Санаторый-прафілакторый “Сонечны” карыстаўся папулярнасцю не толькі ў добрушскіх папернікаў і працаўнікоў аб’яднання “Беллеспаперапрам”. З глыбіні 512 метраў здабывалі мінеральную ваду, якая выкарыстоўвалася для ваннаў, а таксама як пітная.

**– Адзін, як кажуць, у полі не воін. Што можаце сказаць пра сваіх былых падначаленых?**

– На прадпрыемстве ў час майго дырэктарства працавалі каля 3,5 тысячы чалавек. Паверце, я і цяпер памятаю кожнага з іх. Заўсёды з цеплынёй успамінаю старшыню прафкама І. Паршакова, галоўнага механіка В.Мельнікава, галоўнага энергетыка А. Лясоту, галоўнага інжынера Б.Лянкова, начальніка папяровага цэха А. Галавачова, рабочага А.Іваненку і іншых.

Сёння ў добрушскіх папернікаў нялёгкі час. Але ўпэўнены – калектыў знойдзе сваё месца пад сонцам, будзе апраўдваць сваё імя – “Герой працы”.

**Мікола ШЫШОЎ**

**ПОЖАРНАЯ БЕЗОПАСНОСТЬ**

# Чтобы праздник не омрачился бедой

**Во всех районных центрах и областных городах 23 декабря будет проводиться республиканская акция «Безопасный Новый год». Участие в ней примут активисты Белорусского молодежного общественного объединения спасателей-пожарных, представители Белгосстраха и Министерства по чрезвычайным ситуациям.**

Ее цель – предупреждение пожаров и несчастных случаев в результате использования пиротехники.

В период с 24.12.2010 г. по 03.01.2011г. в республике в результате нарушений правил пожарной и личной безопасности при использовании пиротехнических изделий произошло 3 пожара, 27 человек, в том числе 5 детей, получили травмы. Об этом сообщил заместитель начальника РОЧС Сергей САДОВСКИЙ.

Каждый год в канун новогодних праздников дети и взрослые с восторгом зажигают бенгальские огни, петарды, любуются фейерверками. В эти моменты никто не думает о том, что взрывы и вспышки пиротехнических изделий могут нанести серьезный вред здоровью. Травмы и ожоги рук, лица, глаз – эти «воспоминания» о встрече Нового года могут остаться на всю жизнь.

Чтобы этого не случилось, сотрудники МЧС напоминают:

1. Не приобретайте пиротехнику на базаре или лотках. Покупать пиротехническое изделие можно только в специальных магазинах, которым разрешено продавать такую продукцию. Особое внимание обращайте на срок годности и происхождение товара. Не покупайте изделия сомнительного вида, имеющие повреждения или деформацию корпуса.

2. Обязательно ознакомьтесь с инструкцией по применению и строго следуйте ей.

3. Храните приобретенную пиротехнику в сухих местах, удаленных от нагревательных приборов.

4. Площадка для фейерверка должна быть расположена на расстоянии не менее 50 метров от жилых домов, над ней не должно быть ветвей деревьев, линий электропередач и других препятствий.

5. Нельзя запускать фейерверки с балкона или окна. Поджигать фейерверк лучше с расстояния вытянутой руки горящей бенгальской свечой.

6. Когда пиротехника отгорит и отстреляет, не подходите к ней сразу, так как возможно, что сработал еще не весь заряд.

Для того чтобы удивить своих родных и близких на Новый год, вовсе не обязательно выкладывать приличную сумму денег за большой «салют», купив при этом большую проблему. Может, лучше порадовать себя и своих детей другими, безопасными, подарками?




**Людмила НАЗАРОВА**

КАМУНАЛЬНАЯ ГАСПАДАРКА

# Прадпрыемства стабільна развіваецца



***Не кожны спажывец камунальных паслуг уяўляе, які няпросты шлях робіць гарачая вада, перш чым пальцэцца з вашага крана або запоўніць батарэі ацяплення. І гэта толькі адзін накірунак дзейнасці КУП "Добрушскі камунальнік". Камунальная гаспадарка – складаны арганізм, ад зладжанай работы якога залежаць камфортны быт грамадзян, стабільная дзейнасць прадпрыемстваў і ўстаноў раёна.***

У нашым раёне пражывае каля 40 тысяч чалавек, з якіх 31,1 тысячы карыстаюцца жыллёва-камунальнымі паслугамі. На балансе прадпрыемства знаходзяцца 41 кацельня, 75 артэзіянскіх свідравін, станцыя другога ўздыму вады, 840 шахтных калодзежаў, 36 водanaпорных вежаў, 49 кіламетраў цеплавых і 313 водаправодных сетак. Гаспадарка немалая, таму на прадпрыемстве працуюць 689 чалавек.

Няпростыя задачы даводзіцца вырашаць камунальнікам у бягучым годзе. Значны рост кошту на энерганосьбіты ўскладніў выкананне прагнозных паказчыкаў, але распрацаваная праграма па зніжэнні іх спажывання (перавод кацельняў на мясцовыя віды паліва), змяншэнне матэрыяльных і працоўных рэсурсаў, дазволілі дастойна выйсці са складанай эканамічнай сітуацыі. Па гэтых пазіцыях (улічваючы страты пры аказанні жыллёва-камунальных паслуг насельніцтву) мы зменшылі страты на 8,2%. Доля мясцовых відаў паліва ў агульным паліўным балансе прадпрыемства складае 21,6%.

Прыбытак ад усіх відаў дзейнасці, улічваючы бюджэтную субсідыю, склаў 40,1 мільярда рублёў і вырас у параўнанні з мінулым годам на 42%. Усё гэта дазволіла забяспечыць своечасовую выплату заробкаў, падаткаў, аплату энерганосьбітаў, мы змаглі накіраваць 700 мільёнаў рублёў уласных сродкаў на інвестыцыі ў асноўны капітал.

У бягучым годзе на развіццё прадпрыемства прыцягнута 7942 мільёны рублёў інвестыцый. За 11 месяцаў бягучага года прадпрыемствам аказана паслуг насельніцтву на 4620 мільёнаў рублёў.

Сярэдні заробак па прадпрыемстве ў лістападзе склаў 1388,5 тысячы рублёў. Фінансавае становішча прадпрыемства істотна пагаршае дэбіторская запазычанасць за аказанне жыллёва-камунальных паслуг, якая на 1 лістапада склала 1507 мільёнаў рублёў.

Не ўсё яшчэ атрымліваецца ў плане добраўпарадкавання населеных пунктаў раёна. Прычын тут шмат, у тым ліку і маральных. Адзначаны шматлікія факты вандалізму з боку маладых людзей. Прадпрыемства нясе матэрыяльныя выдаткі, а жыхары – маральныя. Дарожныя знакі, лаўкі, дошкі для аб'яў, гульнявыя пляцоўкі – усё гэта ламаецца, руйнуецца, прыводзіцца ў нягоднасць.

І тым не менш, намі робіцца ўсё магчымае, каб вёскі і горад Добруш мелі прыстойны выгляд, радавалі позіркі грамадзян, асабліва дзяцей. Напэўна, чытачы газеты заўважылі і ацанілі намаганні камунальнікаў па добраўпарадкаванні сквера па вуліцы Савецкай.

Напярэдадні свята горада тут заменены састарэлыя лаўкі, укладзены бардзюрны камень і асфальта-бетоннае пакрыццё. На травяных газонах устаноўлены гульнявыя комплексы, горкі, арэлі. Сквер стаў папулярным месцам адпачынку добрушскіх матуль і іх дзяцей. На яго добраўпарадкаванні асвоена звыш 290 мільёнаў рублёў. Сёлета адкрыта алея памяці, прысвечаная Героям Савецкага Саюза, ураджэнцам нашага раёна. Спецыялісты прадпрыемства зрабілі ўсё магчымае, каб ва ўстаноўлены тэрмін работы былі завершаны.

Значны аб'ём работ па добраўпарадкаванні выкананы КУП "Добрушскі камунальнік" у мікрараёне "Меліяратар". Праведзена замена дарожных знакаў, нанесена гарызантальная дарожная разметка. На стадыі завяршэння работы па мадэрнізацыі кацельні, устаноўцы новага сучаснага абсталявання, у тым ліку і кагенерацыйнай устаноўкі, што дазволіць адначасова выпрацоўваць цеплавую і электрычную энергіі. Кагенератары – сур'ёзная альтэрнатыва традыцыйным генератарам энергіі, бо яны выпрацоўваюць больш танныя цяпло і электрычную энергію. Па вуліцы Фрунзе ўстаноўлены два новыя аўтапавільёны.

Вытворчыя планы і іх выкананне не магчымы без працаздольнага калектыву. На прадпрыемстве працуе шмат адданых галіне работнікаў. Менавіта яны – наша галоўнае багацце: намеснік дырэктара М.М. Кавецкі, начальнік кацельні "Меліяратар" А.У. Шаўцоў, вадзіцелі В. Кавалёў і Ф. Жарносенка, трактарысты А. Багадзяш, М. Панфілаў, М. Шчарбакоў, слесар П. Дунай і многія іншыя.

Сёння выжывае і развіваецца тое прадпрыемства, якое ўмее разледзець перспектыву і выгаду. Толькі якасна змяніўшы свядомасць, мы зможам якасна змяніць і само жыццё.

**Аляксандр КСЕНАФОНТАЎ,**
**генеральны дырэктар КУП "Добрушскі камунальнік"**

КУЛЬТУРА

# Несці добры настрой



*Напярэдадні Новага года мы сустрэліся з начальнікам аддзела культуры райвыканкама Рыгорам Козыравым, каб даведацца, што новага прапануюць жыхарам раёна работнікі культуры ў святочныя дні, з якімі здабыткамі праводзяць яны стары і сустрэнуць Новы год*

**– Рыгор Пятровіч, заканчваецца апошні месяц 2011 года, на парозе – наступны, 2012-ы. А што асабіста для Вас азначае гэта свята?**

– Яно асацыіруецца з дабрынёй. Добрай казкай, добрымі пажаданнямі, добрымі надзеямі. Пагадзіцеся, што гэтыя словы самым непасрэдным чынам звязаны са святам. А яшчэ, безумоўна, – чаканнем нечага новага, светлага. Я па прыродзе – аптыміст і перакананы, што чалавек абавязкова павінен верыць у лепшае. І не толькі верыць, але сваімі ўчынкамі і старанай працай набліжаць яго надыход.

**– А з якімі вынікамі сустракае Новы год калектыў аддзела культуры? Вас назначылі яго кіраўніком нядаўна і тым не менш, Вы, напэўна, можаце сёння падвесці некаторыя вынікі работы галіны?**

– Сказаць, што культурна-асветніцкая работа для мяне незнаёмая, нельга. Усё маё жыццё так ці інакш звязана з культурай. А калі гаварыць пра вынікі работы галіны, яны, безумоўна, ёсць. Ужо сёння можна сказаць, што даведзеныя планавыя паказчыкі па творчай, пазабюджэтнай дзейнасці, энергазберажэнні і сацыяльных стандартах выкананы.

Нягледзячы на складанае фінансавае становішча ўдалося забяспечыць паступальнае развіццё галіны, захаваўшы кадры.

Галоўная наша каштоўнасць – людзі. А ў культуры, па маім глыбокім перакананні, працуюць толькі апантаныя людзі. Тыя, хто не лічыцца з асабістым часам, праблемамі і абставінамі. Такіх працаўнікоў шмат. А гэта значыць, што культура будзе жыць і развівацца.

**– Якія задачы давядзецца вырашаць работнікам культуры ў наступным годзе?**

– Самая галоўная задача – павышэнне якасці мерапрыемстваў, якія мы праводзім. Мерапрыемства дзеля мерапрыемства – гэта нонсэнс. Гледачы галасуюць нагамі. Калі мерапрыемствы нецікавыя, людзі проста не ходзяць на іх. Калі нехта з чытачоў прысутнічаў на канцэрце, прысвечаным 85-годдзю раёна, павінен быў звярнуць увагу на пабудову праграмы і якасць канцэртных нумароў.

**– Вы сказалі, што працуеце ў цяжкім фінансавым становішчы, а якім чынам удаецца папаўняць недахоп бюджэтнага фінансавання?**

– Стараемся зарабляць. Тут усё ўзаемазвязана: больш заробім пазабюджэтных сродкаў, лепш умацуем матэрыяльную базу. Умацуем матэрыяльную базу – павысім якасць паслуг. Павысім якасць – больш заробім.

Мы знаходзімся ў пастаянным пошуку новых формаў работы. Пашыраем спектр платных паслуг, прывабліваем людзей навізной і якасцю. Гэта вечары адпачынку, канцэрты для працаўнікоў раёна і вобласці, агеньчыкі, прафесійныя святы, дзіцячыя тэатралізаваныя прадстаўленні, выстаўкі-продажы прадукцыі майстроў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, правядзенне вясельных праграм і юбілеяў.

Усе свае паслугі мы стараемся набліжаць да матэрыяльных магчымасцей людзей. За 11 месяцаў бягучага года мы змаглі прыцягнуць у галіну звыш 300 мільёнаў рублёў.

**– Што і казаць, добрая прыбаўка да бюджэту. А што новага вы можаце прапанаваць дабрушанам у перыяд навагодніх святаў?**

– Мы прапануем правядзенне і арганізацыю навагодніх баляў, калядныя праграмы, вечары адпачынку, танцпол-праграмы, дзіцячыя ранішнікі, спектаклі, паслугі Дзеда Мароза і Снягуркі. Усе мерапрыемствы разлічаны на любую ўзроставую катэгорыю.

Працягваючы традыцыі мінулых гадоў, мы плануем правядзенне дзіцячага навагодняга прадстаўлення "По щучьему велению". Спектакаль пройдзе не толькі ў раённым Доме культуры, але і ў іншых установах культуры раёна. Яшчэ раз паўтараю, што кошт на нашы паслугі носіць сімвалічны характар. Галоўная мэта – дарыць людзям радасць.

**Гутарку вёў Леанід ДУБОЎСКІ**
**Фота Яўгена УСЦІНАВА**



# Адказнасць за невыкананне паказчыкаў па энергаспажыванні стане больш жорсткай

**Урад Беларусі плануе ўзмацніць адказнасць прадпрыемстваў за невыкананне паказчыкаў па энергаспажыванні. Аб гэтым заявіў 15 снежня прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч на пасяджэнні дзеючым семінары кіруючых работнікаў рэспубліканскіх і мясцовых дзяржаўных органаў на тэму «Імпартазамяшчэнне як важнейшы фактар дасягнення збалансаванага развіцця эканомікі Рэспублікі Беларусь».**

Паводле слоў Міхаіла Мясніковіча, асаблівую трывогу ва ўрада выклікае пазіцыя шэрагу кіраўнікоў, якія сістэмна не выконваюць даведзеныя заданні па эканоміі паліўна-энергетычных рэсурсаў. Заданні па энергаэфектыўнасці на пяцігодку правалены «Беллегпрамам», «Беллеспапрапрамам», «Белнафтахімам». Сярод абласцей, што найбольш адстаюць па энергаэфектыўнасці, Віцебская вобласць. «Даводзіцца канстатаваць, што напружанне па вертыкалі перадаецца слаба», – сказаў прэм'ер-міністр.

У сувязі з гэтым ён запатрабаваў ад Дэпартамента па энергаэфектыўнасці заняць больш жорсткую пазіцыю адносна прадпрыемстваў. «Усюды неабходна ўвесці жорсткія, драконаўскія заданні па зніжэнні энергаёмістасці без права адмяніць санкцыі за іх невыкананне, – заявіў Міхаіл Мясніковіч. – Каб не ўганяць дзяржпрадпрыемствы ў даўгі, штрафы, трэба спаганяць з тых, хто непасрэдна нясе адказнасць за гэта пытанне».

АЦЯПЛЯЛЬНЫ СЕЗОН

# Хто па брыкет, хто па дровы



*Анамальна цёплае надвор'е, якое стаіць увесь снежань, не павінна ўводзіць нас у зман: халады абавязкова прыйдуць, зіма возьме сваё. Паклапаціцца пра цяпло ў сваім доме кожнаму гаспадару неабходна загадзя. Але, на жаль, пэўная колькасць домаўладальнікаў успамінаюць пра гэта пасля таго, як спалена апошняе палена.*

*Аб тым, як складваецца справа з забеспячэннем насельніцтва і арганізацый раёна палівам зараз, гутарым з дырэктарам Добрушскага філіяла КУП "Гомельаблпаліва" Аляксандрам Фёдаравічам Васькаўцовым.*

– Праблемы існуюць там, дзе работа вядзецца хаатычна, бесплапава. У нас у гэтым сэнсе ўсё ў парадку. За 11 месяцаў рэалізавана 3446 тон торфабрыкету і 3202 складскія метраў дроў.

**– Калі можна, нагадайце чытачам газеты, хто мае права на набыццё паліва праз філіял.**

– Грамадзяне, якія пражываюць на тэрыторыі горада і раёна і не маюць у сваіх дамах цэнтральнага і газавага ацяплення, а таксам грамадзяне, жылыя дамы якіх адключаны ад газавага ацяплення, што пацвярджаецца даведкай РВУ "Добрушрайгаз".

**– Ці існуюць нормы водпуску паліва?**

– Рашэннем аблвыканкама ўстаноўлены наступныя нормы водпуску паліва: 3 тоны торфабрыкету ці 8 складскіх метраў дроў на адно домаўладанне адзін раз у каляндарны год. Чакаецца, што са студзеня нормы водпуску будуць зменены, аб чым мы своечасова паведамім грамадзянам.

**– Што неабходна мець, каб выпісаць паліва па фіксаванай цане?**

– Торфабрыкет або дровы рэалізуюцца ўласніку, наймальніку домаўладання пры ўмове яго пражывання ў гэтым доме, а сам факт пражывання пацвярджаецца наяўнасцю прапіскі або рэгістрацыі ў гэтым доме. І, як ужо адзначана, домаўладанне не павінна быць падключана да цэнтральнага ці газавага ацяплення. А таму для выпіскі паліва неабходна прад'явіць дакумент, які сведчыць асобу домаўладальніка з наяўнасцю прапіскі ці рэгістрацыі па ўказаным адрасе.

**– Колькі каштуе паліва сёння?**

– На мой погляд, цана прымальная. Не забывайце, што на паліва яна фіксаваная і складае для насельніцтва 105 тысяч рублёў за тону торфабрыкету. Кошт аднаго складскога метра дроў вагаецца ад 23 да 25 тысяч рублёў. Цана складскога метра залежыць ад даўжыні цуркі. Пры адным метры даўжыні – 25 тысяч рублёў, пры двух метрах – 23 тысячы. Шэраг грамадзян, да ліку якіх належаць інваліды і ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны, маюць ільготы на набыццё паліва.

Між іншым, тона торфабрыкету абыходзіцца для філіяла значна даражэй. Розніца ў цане датуецца раённым бюджэтам.

Акрамя названых паслуг, мы займаемся колкай дроў. Кошт аднаго прычэпа (8 складскіх метраў) колатых дроў складае для жыхароў раёна 381,9 тысячы рублёў. А цяпер палічыце: калі вам пашанцуе, вы зможаце набыць у прыватніка прычэп дроў за 550-600 тысяч рублёў. Яшчэ каля 100 тысяч прыйдзецца заплаціць за тое, каб пасекчы іх. Дык дзе больш выгадна?

**– Аляксандр Фёдаравіч, ці складана сёння выпісаць паліва, ці існуе чарга?**

– На дадзены момант па торфабрыкеце працуем з колаў. Прычына банальная: многія гаспадары ўспомнілі пра неабходнасць набыцця торфабрыкету толькі з надыходам зімы. Але сказаць, што існуе невырашальная праблема, нельга. Што тычыцца дроў, яны маюцца ў філіяле ў неабходнай колькасці, заяўкі на іх выконваюцца ў самыя сціслыя тэрміны.

У грамадзян існуе рэальная магчымасць без псавання нерваў і пераплат папоўніць запас паліва, каб зрабіць жыццё ў сваім доме больш утульным і камфортным.

**Леанід ДУБОЎСКІ**

